УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.8
ISBN: 978-985-21-0532-3


***Вартазаран Н.А.***

**СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫ РАННЯЙ ДЫЯГНОСТЫКІ АНКАЛАГІЧНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ У ДЗЯЦЕЙ**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н.В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Наш арганізм пабудаваны з маленькіх будаўнічых цаглінак , кожная з якіх і ёсць клетка. Уявіце сабе сто мільёнаў, мільярдаў клетак. Гэтыя клеткі такія малюсенькія, што навукоўцам даводзіцца карыстацца мікраскопам, каб вывучыць іх. Калі дзіця расце, кожная з гэтых клетак ўвесь час змяняецца,і лік іх павялічваецца. Але ўсе гэта адбываецца па правілах і пад строгім кантролем прыроды. Часам нейкая клетка перастае слухацца і пачынае паводзіць сябе дрэнна. Яна павялічваецца без усялякага кантролю, пачынае выганяць здаровыя клеткі і замест іх распаўсюджваецца па ўсім целе. Так пачынаецца рак.

Злаякасныя новаўтварэнні з’яўляюцца адной з найбольш складаных медыка-сацыяльных праблем сучаснага грамадства. Анкалагічныя хваробы наносяць грамадству вялікую сацыяльную і эканамічную шкоду. Колькасць такіх захворванняў павялічваецца з кожным годам. Няма сэнсу гаварыць аб тым, наколькі актуальная гэта праблема для Беларусі, якая апынулася ў самым пекле чарнобыльскай трагедыі.Гэта праблема, на вялікі жаль, закранае і дзяцей.

У дадзенай працы разглядаюцца наступныя пытанні: па якіх сімптомах бацькі могуць зразумець, што дзіця сур’ёзна хворае; у чым заключаецца праблема ранняй дыягностыкі злаякасных новаўтварэнняў у дзяцей; асаблівасці развіцця злаякасных пухлін у дзяцей; метады прафілактыкі і рэабілітацыі ў дзіцячай анкалогіі.

Рост анкалагічных захворванняў у апошні час набывае ў свеце характар сусветнай эпідэміі, таму гэта праблема асабліва актуальная.

Репозиторий БГМУ